**Каралькевіч** Сяргей Генадзевіч // Памяць. Расонскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. А. М. Хількевіч. — Мн. : БелЭН імя П. Броўкі, 1994. — С. 546.

## КАРАЛЬКЕВІЧ СЯРГЕЙ ГЕНАДЗЕВІЧ

Нарадзіўся 25.5.1964 г. ў в. Залюбежжа. Беларус. У 1979 г. скончыў васьмігадовую школу ў в. Альбрэхтава, у 1983 г. – ПТВ № 108 у г. Колпіна Ленінградскай вобл. Па спецыяльнасці мантажнік-вышыннік стальных і жалезабетонных канструкцый. У маі 1983 г. прызваны ў Савецкую Армію РВК г. Колпіна. Сяржант С. Г. Каралькевіч загінуў 28.4.1984 г. Пахаваны ў в. Альбрэхтава. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

…Камандзір разлікумінамётнай батарэі С. Г. Каралькевіч у той дзень быў з ротай на заданні ў гарах. Калі спускаліся ў цясніну, трапілі пад абстрэл маджахедаў і Сяргей быў цяжка паранены. Памёр ад страты крыві.